УДК 82.09 (476)

**М.М. Караткоў**
(Магілёў, Беларусь)

# ТВОР АБ “ЗЛОМНЫМ ЧАСЕ”

*У артыкуле разглядаюцца некаторыя аспекты ідэйна-вобразнай структуры драмы “Злом” А.Дударава і ацэнак гэтага твора ў літаратурнай крытыцы.*

Да драмы “Злом”, завершанай у 1988 годзе, у творчым актыве А. Дударава ўжо былі такія выдатныя творы, як “Вечар”, “Радавыя”, “Парог”, што сталі класічнымі ў беларускай драматургіі. Новая п’еса, у адрозненне ад іх, не сустрэла вялікай прыхільнасці ні ў чытачоў, ні ў крытыкі. І ў тэатрах ставілася лічаныя разы. А водгукі літаратурных крытыкаў на “Злом”, што з’явіліся не толькі адразу пасля



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яго з'яўлення ў друку, але і праз дзесяць гадоў пасля таго, былі ў некаторых момантах унутрана супярэчлівыя, а часам, як на наш погляд, і не зусім карэктнымі ў плане аб'ектыўнасці аналізу самога тэксту драмы.

У чым жа прычына такой з'явы? Як нам уяўляецца, усё вызначалася некалькімі фактарамі. Перш за ўсё, бадай, задачай, якую ставіў перад сабой мастак слова і хуткаплыннасцю змен у грамадскім жыцці ў той бурны перыяд яго гісторыі, які называлі перабудовай. Яна пачалася ў 1985 годзе пад лозунгам паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Але ў пачатку 1987 года партыя ўзяла арыенцір на вяртанне да "ленінскіх нормаў", пабудову "сацыялізму з чалавечым тварам", дэмакратызацыю ўсіх бакоў жыцця грамадства. Была абвешчаная палітыка галоснасці, што ўжо праз некаторы час прывяло да карэннай пераацэнкі гісторыі савецкай краіны, асабліва перыяду культу асобы Сталіна.

Атрымалася, відаць, так, што новы твор А. Дударава з яго пафасам развянчання міфу аб высокім узроўні маральнасці сацыялістычнага грамадства станавіўся як бы і неактуальным. Бо аб тым жа адкрыта сказала і сама ўлада. І больш таго, намеціла шлях да выпраўлення становішча. Гэта на нейкі час выклікала эйфарыю, ад якой неўзабаве вылечыла катастрафічнае абвастрэнне крызісу ва ўсіх сферах жыцця краіны. Не мінуў ён і драматурга, дапоўніўшыся і крызісам творчым, што слушна зазначыў у свой час М. Тычына [6, с. 9].

Давер да кіраўніцтва дзяржавы імкліва падаў. У поўны рост паўстала пытанне аб шляхах пераадолення крызісу, аб той сацыяльна актыўнай сіле, якая здолее з яго вывесці. А новая п'еса А. Дударава не давала адказу на гэтыя пытанні, не малявала партрэт "героя новага часу", які ў пару напісання твора яшчэ і не праявіў сябе ў жыцці.

Сапраўды, пра што расказваецца ў п'есе? Пра некалькіх бамжоў, што знайшлі прытулак у хатцы на гарадскім сметніку. Яны нават імёнаў сваіх не маюць, толькі мянушкі: Хітры, Піфагор, Дацэнт, Пастушок, Афганец. Піфагор калісьці расстрэльваў "ворагаў народа", пераступіўшы чалавечае ў сабе ў імя "светлай будучыні". А каго у іх залічвалі, зразумеў толькі тады, калі сярод асуджаных аказаўся яго брат.

Пастушок, чалавек *"са спалоханай душой"* [3, с. 212], пакрыўджаны, як часам кажуць, Богам і людзьмі, у хатцы на сметніку знайшоў ціхі прытулак. Сюды ж сышоў і Дацэнт, які раптам усвядоміў, што жыў не так, як трэба было, і праз тое загубіў самае дарагое, што меў на свеце. І Афганец, які калісьці не здолеў знайсці мужнасці падарваць апошняй гранатай сябе і сябра, каб не трапіць жывымі ў палон да маджахедаў. Сябра яны закатавалі, а сам ён толькі цудам застаўся ў жывых.

Цяжэй сказаць, што прывяло ў хатку Хітрага, хаця тэкст твора дае такія-сякія падставы для здагадак наконт гэтага. Часам наведвае жыхароў хаткі Русалка, дзяўчына таксама, відаць, з пакручыстым лёсам, якая ўпадабала Афганца.

Адным словам, персанажы "Злому" ўяўлялі сабой набор асацыяльных тыпаў, ад якіх грамадству няма ніякай карысці. Праўда, і шкоды таксама, бо свой кавалак хлеба надзённага яны здабываюць сумленнай працай. Але грамадзянская іх актыўнасць роўная нулю. Нездарма крытыкі ледзь не ў адзін голас адзначалі падабенства драмы да такіх твораў, як "На дне" М. Горкага, "Эмігранты" С. Мрожака, "У чаканні Гадо" С. Бекета, "Жыццё чалавека" Л. Андрэева".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Між тым сам час патрабаваў героя дзейснага, здольнага пабудаваць грамадства на асновах дабра і справядлівасці. Думаецца, менавіта гэтая акалічнасць і абумовіла адпаведную настроям той пары рэакцыю на “Злом” з боку літаратурнай крытыкі.

З аднаго боку, яны, як, напрыклад, П. Васючэнка, не адмаўлялі правамернасці прыёму *“сцвярджэння гуманістычнага ідэалу “ад адваротнага” – праз негатыўны досвед, праз аналіз незавершанага ці нават бясплённага шляху да этычнай дасканаласці”* [2, с. 260]. Але тут жа папракалі драматурга ў бясплённасці, крызісе *“маральнага пошуку, які ў гэтым творы не знаходзіць паўнацэннага працягу, новых рашэнняў”* [2, с. 261–262].

Іншымі словамі кажучы, галоўная прэтэнзія да твора – зноў-такі адсутнасць вобразаў “новых людзей”, “герояў новага часу”. П. Васючэнка прыходзіць да высновы, што А. Дударавым *“была зроблена спроба падаць такі варыянт этычнага пошуку, пры якім аднаўленне занядбаных каштоўнасцей робіцца немагчымым”*. Інакш кажучы, “Злом” бачыўся ўвасабленнем ідэі няздольнасці людзей *“знайсці Бога ў сваіх душах”* [2, с. 263]. Па сутнасці, амаль тое ж сказаў і А. Бельскі: *“Фінал п’есы поўны безвыходнасці, драматызму”*. Але разам з тым ён падкрэсліваў, што *“нельга не адчуць, што драматург скіроўвае нас на сцежку маральнага, чалавечага, Боскага, што зацепліць новы дзень”* [1, с. 206].

Такое разыходжанне ў ацэнцы пафасу твора тлумачыцца, відаць, перш за ўсё розніцай у поглядах крытыкаў яго на персанажы. П. Васючэнка лічыць, што гэта, па сутнасці, *“лішнія людзі”*, якіх грамадства *“нібыта паводле загадзя распрацаванай сістэмы “выбракоўвае”, адкідвае ад сябе”*. І сцвярджае, што яны *“не адчуваюць маральнай неабходнасці супраціву, як не адчуваюць і іншых духоўных патрэбаў – рэфлексіі, самааналізу, пакаяння, самаўдасканалення”* [2, с. 261].

А. Бельскі таксама зазначаў, што на дно жыцця герояў “Злому” *“адпрэчыла грамадства, выкінула, як непатрэбныя адкіды”*. Але ў той жа час падкрэсліваў, што героямі кіруе *“прага самаачышчэння, пошуку ісціны”*: *“У душы кожнага з герояў жыве мінулае, бо якраз там засталося тое, што не дае спакою, прымушае пакутаваць, шукаць праўдзівы сэнс у сваім існаванні”* [1, с. 205]. І выказваў думку, што *“філасофія звалкі ў свабодзе паводзінаў і думак, і гэта дапамагае Дацэнту, Піфагору, Афганцу, Русалцы хоць на момант знайсці сапраўдную вартасць жыцця”* [1, с. 205–206]. Паспрабуем звярнуцца да тэксту твора і ўзважыць аргументы крытыкаў на карысць сваіх высноў.

Што тычыцца адсутнасці маральнай неабходнасці супраціву, рэфлексіі, самааналізу, пакаяння ды самаўдасканалення, то аналіз твора ў большай ступені пацвярджае высновы, зробленыя А. Бельскім. Сапраўды, героі твора ўсвядомілі бездухоўнасць у жыцці грамадства і ўласных паводзін у мінулым. Таму спрыялі розныя акалічнасці іх жыцця, у кожнага свае. Вынік жа быў адзін – нязгода, пратэст супраць “нормаў звычайнага чалавечага жыцця”, якія замінаюць рэалізацыі сапраўднай чалавечай сутнасці. Гэты пратэст і выліваецца ў форму бамжавання. Атрымліваецца, што не грамадства адмовілася ад жыхароў хаткі на сметніку, а яны ад грамадства, звёўшы сувязі з ім да мінімуму, які дазваляе задаволіць свае патрэбы ў кавалку хлеба надзённага.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэта дае персанажам п’есы свабоду ад ціску грамадства, магчымасць быць самімі сабой і не прымаць міжвольнага ўдзелу ў зле. А няўдзел у зле – гэта ўжо не зло, як зазначыў і сам А. Дудараў у адным з інтэрв’ю [4, с. 5]. Іх клопат іншы – пакаянне ў сваіх грахах супраць сапраўды чалавечных нормаў жыцця, самапакаранне за іх парушэнне. Піфагор і Афганец становяцца на шлях непраціўлення злу насіллем, даруючы і здзекі, і пабоі. “*Я даў сабе зарок: нікому ніколі не скажу ні слова... Што б са мной ні рабілі, як бы ні здзекаваліся, слова не скажу...*” – прызнаецца Русалцы ў вытоках сваёй “нематы” пасля гібелі сябра Афганец” [3, с. 234].

Разам з тым героі твора спрабуюць знайсці спосабы ўсталявання гармоніі ў жыцці грамадства. Заўважым, што яны адвяргаюць хрысціянскае веравучэнне або марксізм у “чыстым” іх выглядзе. Мабыць, таму, што іх панаванне так і не прыняло да практычнага ўсталявання гармоніі ў жыцці грамадства. І ў сваіх пошуках абапіраюцца найперш на ўласныя назіранні і самааналіз.

Хітры ды Піфагор нават ствараюць уласныя “тэорыі” светабудовы. Піфагор прыходзіць да думкі, што “толькі раз’яднанне можа з’яднаць людзей” [3, с. 215], па сутнасці, да нейкай мадыфікацыі тэорыі анархізму. Дацэнт адразу зразумеў, што ажыццяўленне яе будзе мець вынікі, адваротныя надзеям яе аўтара[3, с. 217].

Антыгуманная па сваёй сутнасці і “тэорыя” Хітрага, якая раскрываецца ў сцэне яго з’яўлення ў выглядзе Хрыста. З яе вынікае, што мір і гармонія панавалі ў першапачатковым хаосе, які быў да “стварэння свету”. Касмічны катаклізм разбурыў яго, парадзіўшы ўсё жывое, ад мікроба да чалавека – “гніль і плесень” сусвету. Яны пачалі пажыраць адно другое. І нават Бог не можа спыніць гэты працэс. “Наваяўлены Хрыстос” паведамляе жыхарам хаткі, што Бог-Айцец таму і раіў яму не ісці ў другі раз да людзей, плюнуць на іх, як зрабіў ён сам. Бо людзі і без страшнага суда самі сябе сажруць [3, с. 201]. Безумоўна, Хітры ў гэтым эпізодзе блазнуе, часам на мяжы фолу, нават здзекуецца з гэтай “плесені”. Але блазнаванне – гэта форма пратэсту супраць той ці іншай з’явы. Бо і Хітраму, відаць, не па душы такое “ўзаемапажыранне гнілі і плесені”. Іначай не сышоў бы ён у бамжы.

Пастушок бачыць шлях да духоўнасці ў жыцці людзей ў адмове ад зла: “штонебудзь страшнае нельга рабіць. Пракляццем, спалоханай душой на некага ляжа...” [3, с. 261]. Дацэнт выказвае “геніяльную” здагадку: калі даць чалавеку добрае імя, то ён будзе добрым [3, с. 229]. Ідэал Русалкі – нараджэнне вялікай колькасці дзяцей, без якіх яна “туды” не дабярэцца, праўда, сама не ведае, куды “туды” [3, с. 217].

Плён ідэйных пошукаў герояў драмы практычна нулявы. Але прага духоўнасці не пакідае іх. Аб гэтым сведчаць сцэны і першага, і другога з’яўлення ў хатцы на сметніку “брыгадзістаў”. Гэтыя дабраахвотныя памочнікі ўладаў патрабуюць ад яе насельнікаў вяртання да “нармальнага жыцця” ў грамадстве. Метады, якімі Брыгадзіст і Верны дабіваюцца таго, вычарпальна характарызуюць яго маральны ўзровень. Гвалт, здзек асобы чалавека, прымус да амаральных з пункту яго погляду ўчынкаў (як, напрыклад, “пакаранне” Пастушком і Хітрым па загаду Брыгадзіста Піфагора “за кепскія паводзіны” [3, с. 240], не кажучы ўжо пра ўсё астатняе). І жыхары хаткі на сметніку адказваюць на гэта хто ўцёкамі, а Афганец супрацьпастаўляе сіле сілу і перамагае.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аднак перамога гэта адносная, бо прымус не стымулюе чалавека, у тым ліку і "брыгадзістаў", да духоўнага самаўдасканалення. Відаць, па гэтай прычыне Дацэнт і вызваляе ад пакарання звязаных Брыгадзіста ды Вернага. А сам застаецца з Афганцам чакаць гібелі ад узрыву балона з газам. Думаецца, прычына спробы самагубства Афганца і Дацэнта – той жа пратэст супраць амаральнасці грамадства. Абараніць сілай сваю незалежнасць ад яго малаверагодна. Ды й прывядзе гэта толькі да памнажэння зла. І таму пратэст персанажаў прымае такую крайнюю форму.

Сам па сабе факт іх спробы самагубства, як і фінальная сцэна п'есы, відаць, і паслужылі падставай для вываду аб крайнім песімізме яе аўтара ў поглядах на перспектывы жыцця народа. На наш погляд, гэта не зусім так. Па-першае, фінал твора, у якім усе персанажы твора са свечкамі ў руках і заплюшчанымі вачыма ўзіраюцца праз столь у зорнае неба [3, с. 254], мае прыкметы не столькі алегорыі, колькі сімвалу. А ён, як вядома, можа быць шматзначным. У заключнай мізансцэне "Злому" можна ўбачыць і выражэнне ідэі слепаты чалавецтва, і нямое пытанне да Бога, калі не папрок яму, і выяўленне надзеі на яго.

Па-другое, звернем увагу на некаторыя акалічнасці: перад гэтай мізансцэнай у хатку з'яўляецца Нехта і, па сутнасці, спыняе спробу самагубстства Афганца і Дацэнта: "Не трэба, Віця, не трэба…" [3, с. 254] Словы гэтыя гучаць, як намёк на тое, што не ўсё так безнадзейна. А ў самым канцы п'есы сапсаваны гадзіннік, у цыферблат якога перад тым пільна ўглядаўся Нехта, раптам б'е дванаццаць разоў, абвяшчаючы поўнач. Гэта таксама сімвал. Поўнач па павер'ю – час, калі пачынаецца разгул цёмных сіл, які заканчваецца з надыходам раніцы. І якой бы доўгай ні была ноч, яна абавязкова зменіцца раніцай і днём.

Думаецца, што такім чынам драматург выявіў думку, што грамадства чакаюць няпростыя часы, але ў рэшце рэшт усе зменіцца да лепшага. Бо ўжо ёсць людзі, якія не прымаюць праяў амаральнасці ў жыцці грамадства, шукаюць спосабы выпраўлення становішча. І рана ці пазна знойдуць іх.

На пару напісання "Злому" сказаць большага яго аўтар не мог. Але ён здолеў з пазіцый гуманізму і па-мастацку праўдзіва адлюстраваць і ацаніць рэчаіснасць часоў пачатку "злому" ў жыцці грамадства, які прывёў да кардынальных змен у яго ўладкаванні.

**Спіс літаратуры:**

1. Бельскі, А.І. Імёнаў непаўторнае аблічча / А.І. Бельскі // Сучасная беларуская літаратура. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – С. 201–209.
2. Васючэнка, П. Ад Буслая да Вітаўта / П. Васючэнка // Полымя. – 1995. – № 5. – С. 246–268.
3. Дудараў А. Злом / А. Дудараў // Дудараў, А. Крыж : Зб. п'ес : Для ст. шк. узросту / А. Дудараў; аўт. прадм. Б.Бур'ян. – Мінск : Беларусь, 2002. – С. 197–254.
4. Куртаніч, В. Майстра практычных дыскусій / В. Куртаніч // Крыніца. – 1988. – № 5. – С. 3–5.
5. Тычына, М. Тэхналогія поспеху / М. Тычына // Крыніца. – 1998. – № 5. – С. 3–10.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова